# III ФЕСТЫВАЛЬ НЕФАРМАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ[1]

**8-10 КАСТРЫЧНІКА 2010**

Паважаныя сябры і калегі! Запрашаем Вас прыняць удзел у галоўнай падзеі года, прысвечанай ролі нефармальнай адукацыі ў павышэнні якасці жыцця!

Фестывалі і Тыдні як форма прасоўвання нефармальнай адукацыі і адукацыі дарослых папулярныя ў многіх краінах свету. Беларусь далучылася да фестывальнага руху ў 2006 г. З таго часу Фестываль стаў традыцыйнай пляцоўкай для абмеркавання бягучых пытанняў і перспектыў развіцця нефармальнай адукацыі ў Беларусі і ў еўрапейскіх краінах. У гэтым годзе міжнародны характар праяўляецца асабліва ярка. Асобныя мерапрыемствы Фестывалю нефармальнай адукацыі ўключаныя ў праграму традыцыйнага Тыдня Нямеччыны ў Беларусі.

**Мэтай** III Фестывалю нефармальнай адукацыі з'яўляецца дэманстрацыя **ўнёску** арганізацый нефармальнай адукацыі ў павышэнне **якасці жыцця**.

**Задачы Фестывалю 2010:**

1. Прадставіць нефармальную адукацыю як сістэму, якая забяспечвае развіццё сацыяльных, грамадзянскіх, прафесійных кампетэнцый і творчых здольнасцяў асобы на працягу ўсяго жыцця.
2. Прэзентаваць разнастайнасць праграм (для моладзі, пажылых людзей, сельскіх жыхароў, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, сем'яў, жанчын, мужчынаў, прафесійных груп, няўрадавых арганізацый і інш.).
3. Садзейнічаць абмену вопытам і наладжванню партнёрскіх сувязяў.
4. Абмеркаваць тэндэнцыі і стратэгіі развіцця нефармальнай адукацыі як інструмента павышэння якасці жыцця ў Беларусі і за мяжой.

На працягу трох фестывальных дзён Вас чакаюць:
- прэзентацыі разнастайных адукацыйных праграм і праектаў;
- майстар-класы ў выкананні найлепшых адукатараў;
- творчыя конкурсы;
- дыскусіі па актуальных пытаннях развіцця нефармальнай адукацыі ў нашай краіне і за мяжой;
- цікавая культурная праграма;
- знаёмства з патэнцыйнымі партнёрамі для рэалізацыі Вашых уласных ініцыятыў.

Ад імя АРГКАМІТЭТА III Фестывалю:

*Дзмітрый Карпіевіч,* старшыня Аргкамітэта, старшыня праўлення грамадскага аб’яднання «Адукацыйны цэнтр «ПОСТ»

*Галіна Верамейчык,* Кіраўніца Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб’яднання “Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.‟ (ФРГ) у РБ

*Астрыд Зам,* дырэктар Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Я. Рау

www.dvv-international.by www.adukatar.net

[1] *У адпаведнасці з класіфікацыяй UNESCO да* ***нефармальнай адукацыі*** *(non-formal education) адносяць навучальныя праграмы і курсы, якія праводзяцца па-за межамі традыцыйнай сістэмы адукацыі, дзе вынікі навучання не заўсёды пацвярджаюцца адпаведнымі дакументамі. У Мемарандуме неперарыўнай адукацыі Еўрапейскага Саюза падкрэсліваецца, што кантынуум неперарыўнасці робіць нефармальную адукацыю раўнапраўным складнікам навучання на працягу ўсяго жыцця.*